# ТВОРЧАСЦЬ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА Ў ДЫЯЛОГУ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР: ТРАДЫЦЫІ, НАВАТАРСТВА, НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДМЕТНАСЦЬ

***РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ***

***(Мінск, 29 студзеня 2014 года)***

У 2014 годзе спаўняецца сто год з дня нараджэння аднаго з класікаў беларускай літаратуры Аркадзя Куляшова. Менавіта гэта стала нагодай для арганізацыі канферэнцыі Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі і, у прыватнасці, Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа.

Урачыстае адкрыццё канферэнцыі пачалося з прывітальнага слова А.І. Лакоткі, *дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*; ***Г.П. Пашкова***, *першага сакратара Саюза пісьменнікаў Беларусі*; ***А.А. Кавалені***, *акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук*, які прапанаваў звярнуцца да Прэзідыума НАН з прапановай падрыхтаваць і выдаць збор твораў А. Куляшова.

На адкрыцці канферэнцыі *дырэктарам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры* ***Л.В. Макарэвіч*** была прадстаўлена падрыхтаваная гэтым жа музеем выстава «Ад Бесядзі да акіяна». Удзельнікі канферэнцыі атрымалі магчымасць пазнаёміцца з дакументамі і ўнікальнымі, нябачанымі раней фотаздымкамі з фотаархіва У. Крука. Асобна была адзначана як вельмі каштоўная для супрацоўнікаў музея кніга Т. Голуб «Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова», выдадзеная ў 2012 годзе.

Асабліва цікавым на адкрыцці канферэнцыі быў выступ унука А. Куляшова – ***У.Х. Берберава***. Ён расказаў пра дзеда, як вельмі зацікаўленага назіральніка, выдатнага шахматыста, чалавека з добрымі камбінаторнымі здольнасцямі. Апошняе стала прычынай таго, што А. Куляшоў не перапісваў свае творы, не пакінуў нашчадкам варыянты рукапісаў. Гэтыя камбінаторныя здольнасці перайшлі ў спадчыну і яго сынам-матэматыкам.

**Пленарнае пасяджэнне** распачаў ***А.І. Бельскі*** дакладам *«Паэтычны сусвет Аркадзя Куляшова»*, прадставіў паняцце паэтычнага свету, яго структуру і параметры, вызначыў паэтычны свет А. Куляшова як зямны і касмічны, прыродацэнтрычны, а яго вершы ахарактарызаваў як філасофскі касмізм.

У выступе *«Паэзія Аркадзя Куляшова: абрысы стылю»* ***У.В. Гніламёдаў*** акрэсліў асаблівасці розных перыядаў творчасці паэта, уплыў на яго станаўленне А. Твардоўскага і У. Маякоўскага, адзначыў натуральную цікавасць А. Куляшова да развіцця навукі і новых адкрыццяў.

Як чалавек, знітаваны з пісьменнікам родавымі каранямі, пляменнік А. Куляшова ***В.І. Маслоўскі*** ў сваім дакладзе *«Я хаце абавязаны...»* распавёў пра гісторыю хаты ў Хоціме. Гэта месца, дзе жылі бацькі майстра слова, для дакладчыка таксама духоўна знакавае. Выступовец прадставіў А. Куляшова адданым клапатлівым сынам, які не забываецца і дбае пра радавое гняздо. Было зазначана, што так, як паэт адчуваў адказнасць за родную хату, так ён і баяўся адарвацца ад беларускамоўнай стыхіі, якая жывіла яго сваім багаццем.

Выступ ***М.І. Мушынскага*** *«Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова як паказчык узроўню вывучэння яго літаратурнай спадчыны і біяграфіі»* быў прысвечаны ўжо згаданаму вышэй выданню Т. Голуб, а менавіта аналізу эфектыўнасці тэксталагічных і літаратурных назіранняў, калі яны праводзяцца ў даследніцкім, гісторыка-літаратурным і навукова-папулярным аспектах. Прычым асобна была адзначана важнасць папулярызацыі літаратурных звестак у сучасным грамадстве.

Аркадзя Куляшова як рэпарцёра, публіцыста, чалавека, які меў непасрэднае дачыненне да выдання франтавых газет прадставіў ***М.П. Кенька***. Гэтая частка спадчыны аўтара, на думку выступоўца, мала вывучалася і заслугоўвае ўвагі.

Канферэнцыя працавала па **васьмі секцыях**.

- У першай секцыі **«Паэзія Аркадзя Куляшова ў кантэксце сусветнай літаратуры»** даследчыкі праводзілі паралелі супастаўлення з еўрапейскімі аўтарамі Р. Кіплінгам, У. Шэкспірам, А. Міцкевічам, беларускімі В. Зуёнкам, Ф. Баторыным, разглядалася спецыфіка аўтарскага паэтычнага свету – узаемадзеянне лірыкі і эпікі, формы ўмоўнасці, матыў вернасці сяброўству, катэгорыя часу, вобразы прыроды, у прыватнасці дэндралагічныя.
- Другая секцыя **«Творчая спадчына Аркадзя Куляшова: шляхі і перспектывы даследавання»** разглядала выключна майстэрскія здабыткі класіка: філасофію, прасторава-часавы кантынуум яго твораў, пераклады і аўтапераклады аўтара і інш.
- Даклады трэцяй секцыі **«Аркадзь Куляшоў і тэатральна-драматургічныя інтэнцыі сучаснай Беларусі»** вылучаліся разнастайнасцю. Акрамя драматычных п'ес А. Куляшова, іх параўнання з тво-

рамі М. Арочкі, увасаблення ў радыётэатры, навукоўцы разгледзелі сучасныя жанры драматургіі (монадрама, слэм) звярнуліся да аналізу рускай драматургіі, мясцовай (віцебскай) драматургіі, літаратурнай крытыкі тэатра М. Гарэцкім.

Тэма вайны, гістарычна блізкая беларускаму народу, абмяркоўвалася на секцыі «**Вайна ў творчасці пісьменнікаў розных пакаленняў: спецыфіка мастацкага адлюстравання**». Акрамя спадчыны юбіляра, абмяркоўвалася ўвасабленне гэтай тэмы ў творах Я. Коласа, А. Адамовіча, І. Шамякіна, Р. Барадуліна, М. Гарэцкага, А. Анішэўскай, беларускіх паэтэс другой паловы XX стагоддзя.

Тры секцыі прадставілі даклады па сучаснай літаратуры.

- У секцыі «**Літаратурная класіка ў сучасным прачытанні: на абсягах малой і вялікай прозы**» гучалі даклады па вывучэнні матываў беларускай прозы XX стагоддзя (В. Ластоўскага, А. Мрыя, Я. Коласа, К. Чорнага), польскай (Е. Анджаеўскага), украінскай (І. Філіпчака).
- Выступоўцы секцыі «**Сучасная паэзія: дыялог традыцый і наватарства**» разважалі над традыцыйным і новым у сучаснай беларускай, украінскай, рускай паэзіі, у поле зроку трапіла творчасць такіх аўтараў, як А. Куляшоў, М. Танк, М. Віняцкі, А. Тулупава, З. Марозаў, Л. Тарасюк.
- Літаратура на прадмет новага і ў змесце, і ў форме разглядалася ў секцыі «**Празаічныя жанры ў сучаснай літаратуры: новае мысленне і новая свядомасць**». Некалькі прац прадставілі тэксталагічнае даследаванне твораў І. Шамякіна, што непасрэдна звязана з працай Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі над укладаннем поўнага збору твораў пісьменніка. Была звернута ўвага на жанр сучаснай беларускай навелы, жанравую форму споведзі, прозу нон-фікшн, разгледжаны адметнасці светапогляду ў творах В. Быкава, В. Казько, А. Федарэнкі, У. Бутрамеева, У. Маканіна, Г. Марчука.
- У секцыі «**Сучасныя філалагічныя даследаванні: напрамкі і перспектывы**» былі сабраны пераважна лінгвістычныя даклады, у якіх разглядалася мова твораў не толькі А. Куляшова, але і іншых пісьменнікаў.

**Зборнік дакладаў па выніках канферэнцыі**, як запэўніла загадчык аддзела беларускай літаратуры XX і XXI стагоддзяў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ***А.А. Манкевіч***, плануецца выдаць у сакавіку гэтага года.

Напрыканцы неабходна адзначыць, что канферэнцыя ўразіла сваёй грунтоўнасцю і змястоўнасцю.

***С.М. Лясовіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***